Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________В. М. Міхееў
«____»_____________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ФАЛЬКЛОРНЫ ПРАКТЫКУМ
## Раздзел 2. БЕЛАРУСКІЯ СЯМЕЙНА-РОДАВЫЯ АБРАДЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01
Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці
1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Н. В. Петухова,* выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*аддзел* фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;

*Т. Ф. Сухоцкая,* дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 14.01.2013 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 06.02.2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Н. В. Петухова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Фальклорны практыкум» складаецца з трох раздзелаў: «Беларускі народны каляндар», «Беларускія сямейна-родавыя абрады», «Абрадавая атрыбутыка».

Сямейна-родавыя абрады ўзыходзяць да часоў язычніцтва. Гэта адзін з важнейшых відаў абрадавай творчасці, яго адметная сістэма жанраў прымеркавана да пэўных сямейных рытуалаў. Асноўныя цыклы сямейна-родавых абрадаў: радзінна-хрэсьбінны, вясельны і пахавальна-памінальны, якія адлюстроўваюць важнейшыя падзеі жыцця чалавека: нараджэнне, шлюб, смерць.

Раздзел «Беларускія сямейна-родавыя абрады» вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» разлічаны на тэарэтычнае і практычнае засваенне ведаў у галіне сямейна-абрадавага фальклору беларусаў, і патрабуе высокай ступені кампетэнтнасці спецыялістаў у рэчышчы рэгіянальнага этнафанічнага ўвасаблення традыцыі ў выканальніцкай дзейнасці.

Выкладанне раздзела «Беларускія сямейна-родавыя абрады» вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: «Беларускі фальклор», «Этнаграфія», Міфалогія», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Этнафанічны практыкум» спецыялізацыі «этнафоназнаўства».

*Мэта дысцыпліны* – пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі этапамі развіцця і фарміравання беларускага сямейна-абрадавага фальклору, узбагаціць іх разуменне беларускага сямейна-абрадавага фальклору як унікальнай і самабытнай з’явы беларускай традыцыйнай народнай культуры, якая адлюстроўвае сістэму гуманістычных і сацыяльна-культурных каштоўнасцей беларускага народа.

*Задачы дысцыпліны:*

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– тэарэтычна і практычна азнаёміць студэнтаў з асноўнымі абрадамі сямейна-родавага цыкла і іх структурай;

– выпрацаваць практычныя этнафанічныя ўменні і навыкі выканання народных песень і здольнасці да іх адэкватнага ўвасаблення і інтэрпрэтацыі на сучасным этапе;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– развіццё актыўнага творчага мыслення і самастойнасці меркаванняў, фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі (разуменне спецыфікі і значнасці).

У выніку вывучэння дадзенага раздзела дысцыпліны выпускнік павінен *ведаць:*

– сямейныя абрады беларусаў;

– законы існавання і пераемнасці традыцый у фальклорных асяродках;

– прынцып фарміравання на дакументальнай аснове рэпертуару спеўнай этнафанічнай суполкі, фальклорнага аб'яднання;

– методыку работы педагога-лідара з удзельнікамі ў фальклорным аб'яднанні;

*умець:*

– наладзіць працэс пошуку, развучвання і выканання рэпертуару фальклорнага аб'яднання, складзенага на дакументальнай аснове;

– перадаваць рэгіянальныя асаблівасці беларускага спеўнага фальклору ў галіне інтанавання і гуказдабывання;

– валодаць прынцыпамі мастацка-эстэтычнага кіравання дзейнасцю аматарскіх і прафесійных фальклорных калектываў і аб'яднанняў;

– улічваць асабістыя творчыя асаблівасці ўдзельніка фальклорнага аб'яднання, неабходнасць імправізацыі і самавыяўлення пры фальклорнай дзейнасці.

Раздзел «Беларускія сямейна-родавыя абрады» мае тэарэтычную і практычную скіраванасць, прадугледжвае вывучэнне сутнасці і спецыфікі існавання сямейна-родавых абрадаў, іх структурных кампанентаў і рэгіянальных асаблівасцей, вызначэнне месца і ролі сямейна-родавага фальклору ў жыццядзейнасці беларускага этнасу.

Пры вывучэнні раздзела «Беларускія сямейна-родавыя абрады» выкарыстоўваюцца наступныя метады навучання: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, бяседа, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў, палявых відэазапісаў аўтэнтычных абрадаў, метад слыхавога перайманне ў працэсе актуалізацыі фальклорнай спадчыны), праблемны (творчы дыялог, вопыт, назіранне, эксперымент), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка аўдыя- і відэаматэрыялаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, практыкаванні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны. Падчас самастойнай работы студэнты павінны старанна вывучыць тэарэтычны матэрыял, які быў выкладзены на лекцыйных занятках; прааналізаваць і заканспектаваць матэрыял, прапанаваны выкладчыкам для самастойнага вывучэння, творча перапрацаваць і прадставіць у выглядзе рэферата.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Фальклорны практыкум» усяго адведзена 674 гадзіны, з якіх 326 –аўдыторныя заняткі (126 гадзін – лекцыі, 120 гадзін – практычныя заняткі, 80 гадзін – індывідуальныя заняткі); на вывучэнне раздзела «Беларускія сямейна-родавыя абрады» вучэбнай дысцыпліны «Фальклорны практыкум» прадугледжана 108 гадзін аўдыторных заняткаў (26 гадзін – лекцыі, 42 гадзіны – практычныя заняткі, 40 гадзін – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | практ. | інд. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | | |
| **Раздзел І. Радзіны. Абрад і песні** | | | | |
| **Тэма 1.** Дародавы перыяд | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 2.** Пасляродавы перыяд | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 3.** Хрэсьбіны | 2 | 2 | | |
| **Тэма 4.** Імянарачэнне. Беларуская антрапаніміка | 2 | 2 | | |
| **Тэма 5.** Этнафонія радзін | 22 | | 10 | 12 |
| **Тэма 6.** Паэзія пеставання. Дзіцячы фальклор | 14 | | 6 | 8 |
| **Раздзел ІІ. Вяселле. Абрад і песні** | | | | |
| **Тэма 7.** Перадвясельны перыяд | 2 | 2 | | |
| **Тэма 8.** Перыяд вяселля. Першы дзень | 2 | 2 | | |
| **Тэма 9.** Перыяд вяселля. Другі дзень | 2 | 2 | | |
| **Тэма 10.** Этнафонія вяселля | 18 | | 10 | 8 |
| **Тэма 11.** Жартоўныя песні і танцавальна-прыпевачная этнафонія | 14 | | 6 | 8 |
| **Раздзел ІІІ. Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні** | | | | |
| **Тэма 12.** Перадсмяротны стан | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 13.** Падрыхтоўка нябожчыка да пахавання | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 14.** Пахаванне | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 15.** Шанаванне памерлых. Дзяды | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 16.** Пахавальныя галашэнні (прычыты) | 12 | | 4 | 8 |
| **Раздзел IV. Нетрадыцыйныя сямейна-родавыя абрады** | | | | |
| **Тэма 17.** Провады ў войска | 4 | 2 | 2 | |
| **Тэма 18.** Рэкруцкія песні | 12 | | 6 | 8 |
| **Тэма 19.** Улазіны (уваходзіны) | 2 | | 2 | |
| **Разам…** | **108** | **26** | **42** | **40** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы дысцыпліны. Паняцці «сям'я», «віды сям'і», «віды шлюбаў». Вытокі беларускага сямейна-абрадавага комплексу. Яго генетычная сувязь са старажытнымі культамі і вераваннямі. Функцыянальнае прызначэнне сямейна-абрадавага комплексу. Спалучэнне сакральна-магічнай, абрадавай, цырыманіяльнай, эстэтычнай і выхаваўчай функцый. Сямейна-абрадавы комплекс беларусаў як сродак адаптацыі ў соцыуме. Адлюстраванне побыту, маралі, звычаяў і вераванняў у сямейна-абрадавым комплексе беларусаў. Сутнасць і структура сямейна-абрадавага комплексу.

## Раздзел I. Радзіны. Абрад і песні

### *Тэма 1. Дародавы перыяд*

Звычаі і абрады дародавага перыяду. Павер'і, звязаныя з перыядам цяжарнасці жанчыны. Абрадавыя дзеянні, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці (адразанне і захаванне пупавіны, мадэляванне лёсу бабкай-павітухай).

### *Тэма 2. Пасляродавы перыяд*

Першыя дні жыцця (першае кармленне, першае купанне). Адведкі: аўтэнтычны змест абраду, удзельнікі.

### *Тэма 3. Хрэсьбіны*

Хрышчэнне. Сакральны характар і магічныя функцыі. Традыцыі выбару кумоў. Сістэма забарон і перасцярог. Застольная ўрачыстасць у гонар хрышчэння. Роля сямейнай грамады, бабкі (павітухі), кумоў, суседзяў, родзічаў. Абрад «бабінай кашы». Звычаі і абрады першага года жыцця: першы крок, першы зуб, першае пастрыжэнне. Прыказкі пра адносіны да дзяцей і прынцыпы выхавання. Захаванасць радзіннай абраднасці ў сучаснай традыцыі.

### *Тэма 4. Імянарачэнне. Беларуская антрапаніміка*

Уласныя асабовыя імёны, мужчынскія імёны і прозвішчы, утвораныя ад іх. Жаночыя імёны. Мянушкі. Найменні асоб мужчынскага полу. Найменні асоб жаночага полу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Этнафонія радзін*

Тэматыка радзінных песень, іх сімволіка. Разнастайнасць радзінных песень. Велічальныя хрэсьбінныя песні (да парадзіхі, бабкі, дзіцяці, бацькі, кума, кумы). Жартоўныя песні (пра кума і куму), прыпеўкі і прыгаворкі. Песні радзіннай (хрэсьбіннай) бяседы.

Радзінныя і хрэсьбінныя песні рэгіёнаў Беларусі. Радзінныя напевы Віцебшчыны. Хрэсьбінныя мелодыі Паазер'я.

### *Тэма 6. Паэзія пеставання. Дзіцячы фальклор*

Паняцце «дзіцячы фальклор». Калыханкі (фантастычныя і рэалістычныя). Творы, звязаныя з гульнёй (пестункі, пацешкі, або забаўлянкі, лічылкі, песні-гульні, гульні, гульнявыя прыпеўкі). Творы, не звязаныя з гульнёй (заклічкі, маўчанкі, скорагаворкі, навывараткі, дражнілкі, небыліцы, казкі-забаўлянкі). Каляндарныя песні ў дзіцячым рэпертуары.

## Раздзел II. Вяселле. Абрад і песні

### *Тэма 7. Перадвясельны перыяд*

Суаднесенасць вясельных абрадаў са структурай беларускага народнага календара. Асноўныя этапы вясельнага абраду і іх значэнне. Сватанне. Падрыхтоўка да вяселля. «Вянкі», «Каравай». Каравайны (стаўбавы) рытуал. Прыкметы і павер'і. Любоўная магія. Прысушкі.

### *Тэма 8. Перыяд вяселля. Першы дзень*

Малады збіраецца да маладой. Апрананне маладой. Малады прыязджае да маладой. Збор і выезд да вянца. Вянчанне. Сустрэча маладых. Застолле ў маладой. Адорванне маладой. Ад'езд да маладога. Гумар і сатыра ў вясельным абрадзе. Асаблівасці вяселля сіраты.

### *Тэма 9. Перыяд вяселля. Другі дзень*

Застолле ў маладога. Пасцельны абрад. Адорванне маладога. Змена галаўнога ўбору маладой. Заканчэнне вяселля. Пярэзвы (гасціна, пірагі). Фальклорныя традыцыі ў сучасным беларускім вяселлі. Выкарыстанне элементаў традыцыйнага абраду ў сучасным вяселлі. Абрад вяселля ў мастацкай літаратуры. Прыказкі пра шлюб, выбар пары, адносіны ў сям'і і сямейныя абавязкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 10. Этнафонія вяселля*

Сінкрэтызм вясельнай паэзіі. Вясельная песня як неад’емная частка кожнага абрадавага дзеяння (этапу вяселля). Класіфікацыя вясельных песень, іх змест. Велічальныя песні да маладых. Каравайныя песні. Жартоўна-сатырычныя песні, прыпеўкі, прыгаворы ўдзельнікаў вяселля. Песні нявесты і іх асноўны змест. Песні сіраты. Сімвалічнае значэнне песень вяселля.

Асаблівасці мастацкіх вобразаў і паэтычнай мовы вясельных песень. Гістарычная ўстойлівасць і трываласць захавання і функцыянавання вясельных песень у народным побыце.

Драматургія і рэгіянальны каларыт этнафоніі вяселля: каравайныя песні Палесся; святочна-прыўзняты характар вясельных песень усходняга Паазер’я; лірыка-элегійны каларыт вясельных песень захаду Беларусі; трагедыйны характар вясельных галашэнняў маладой і яе маці на поўначы Беларусі (Паазер’е).

## *Тэма 11. Жартоўныя песні і танцавальна-прыпевачная этнафонія*

*Жартоўныя песні.* Стыхія смешнага ў іх: гратэск, сатыра, гумар, іронія (аўтаіронія), жарт. Эстэтычна-забаўляльная і павучальная функцыі жартоўных песень. Галоўныя героі: дзед і баба, мужык і жонка, хлопец і дзяўчына і інш. Жартоўныя песні пра жывёл, птушак і насякомых. Сацыяльная сатыра. Адлюстраванне ў жартоўнай песні заган у характары і паводзінах людзей. Кампазіцыйныя асаблівасці, што спрыяюць калектыўнаму выкананню жартоўных песень: паўторы, пералічэнні, дыялагічны характар пабудовы сюжэта.

*Прыпеўкі.* Азначэнне і асаблівасці жанру. Прычыны мнагастайнасці народных назваў прыпеўкі. Бытаванне і сувязь прыпеўкі з танцам. Мелодыя і тэкст прыпевак. Сатыра і гумар у іх. Жартоўны сямейна-бытавы характар сюжэтаў. Нечаканасць камічнай развязкі як асноўны сюжэтна-кампазіцыйны прыём.

*Традыцыйныя абрадавыя і побытавыя танцы* рэгіёнаў Беларусі і іх музычнае суправаджэнне. Змест і функцыянальнасць прыпевак да традыцыйных беларускіх танцаў. Характэрныя стылістычныя рысы і музычна-выразныя сродкі выканання прыпевак. Сольная і гуртавая традыцыі выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Пахаванне. Абрады, звычаі, галашэнні

### *Тэма 12. Перадсмяротны стан*

Знакі набліжэння смерці. Запрашэнне святара. Запрашэнне «мяртвячых». Звычай перакладвання паміраючага на зямлю. Звычай акурвання паміраючага. Прыкметы і павер'і.

### *Тэма 13. Падрыхтоўка нябожчыка да пахавання*

Апавяшчэнне пра смерць. Рытуалы абмывання і пераапранання памерлага. Адзенне для памерлага. Выраб труны і перанос у яе нябожчыка. Наведванне роднымі і суседзямі памерлага ў яго хаце.

### *Тэма 14. Пахаванне*

Пахавальныя звычаі ў Беларусі і іх сувязь са старажытным культам продкаў. Вынас труны з нябожчыкам з хаты. Шэсце пахавальнай працэсіі на могілкі. Падрыхтоўка магілы і пахаванне. Пахаванне дзіцяці. Народныя традыцыі і павер'і, звязаныя з праявядзеннем памерлага ў апошні шлях і публічным выражэннем жалобы. Адлюстраванне ў пахавальным абрадзе культу продкаў і іншых старажытных вераванняў і культаў. Захаванасць пахавальнай абраднасці ў сучаснай традыцыі. Прыказкі пра смерць, адносіны да яе, сіроцтва.

### *Тэма 15. Шанаванне памерлых. Дзяды*

Памінкі: сітуацыйныя (3, 6, 9, 40 дзён і г.д.) і каляндарныя (Дзяды масленічныя, троіцкія і восеньскія і Радаўніца). Культ продкаў і яго сувязь з культам плоднасці.

### *Тэма 16. Пахавальныя галашэнні (прычыты)*

Галашэнне як унікальны песенна-рэчытатыўны жанр: імправізацыйны характар, эмацыянальная напружанасць, суаднесенасць з традыцыйнай паэтыкай. Месца пахавальных галашэнняў (прычытаў) у пахавальным рытуале. Традыцыя сольных (адзіночных) жаночых пахавальных галашэнняў (удавіныя, сіроцкія пахавальныя прычыты). Падзел галашэнняў у адпаведнасці з адрасатам. Светапоглядны характар пахавальных галашэнняў, міфалагічныя ўяўленні (пра смерць і вечнасць, няскончанасць кругавароту жыцця і інш.). Паэтычны змест пахавальных галашэнняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імправізацыйнасць мелодыкі пахавальных прычытаў, шчыльная сувязь са словам. Стылі інтанавання пахавальных галашэнняў, іх разнавіднасці (па Т. Б. Варфаламеевай): гутарковы (паўночны захад Гродзеншчыны), песенны (лакалізаваны пераважна ў цэнтральным Палессі), напеўна-рэчытатыўны (паўсюдна). Пахавальныя галашэнні ў наш час.

## Раздзел IV. Нетрадыцыйныя сямейна-родавыя абрады

### *Тэма 17. Провады ў войска*

Гісторыя ўзнікнення абраду (Пятроўская ваенная рэформа ў Беларусі пачатку XVIII ст.). Першыя рэкруцкія наборы ў Беларусі 1794 г. (Магілёўшчына, Полаччына). Ваенная рэформа 1874 г., замена рэкруцкага набору ўсеагульнай воінскай (салдацкай) павіннасцю.

Рытуалы абраду: паездка нававбранца з роднымі ў храм, дзе за яго здароўе служылі абедню, развітанне з аднавяскоўцамі – абход будучым салдатам родных і знаёмых у сваёй вёсцы, вечар-провады, ад'езд на зборны пункт, на якім будучага воіна аплаквалі і благаслаўлялі «чэсна служыць Айчыне». Рытуалы і магічныя дзеянні, «каб хлопец жывым і здаровым вярнуўся назад».

### *Тэма 18. Рэкруцкія песні*

Драматызм і трагедыйнасць паэтычных тэкстаў рэкруцкіх песень. Інтанацыйны строй рэкруцкіх напеваў, іх сувязь з журботна-прычытнай гаворкай. Сувязь стылістычных эталонаў рэкруцкага меласу са стылявымі асаблівасцямі познетрадыцыйнай народнай песеннай класікі.

Паэтычныя вобразы і сюжэты песень. Пранікненне паэтычных вобразаў старажытнай сялянскай песеннай лірыкі, сюжэтаў старадаўніх балад. Заліхвацкасць выгуковых формул, воклічнасць прыпеваў. Лірычныя салдацкія песні. Песні пра вайну 1812 г., Першую сусветную вайну і інш.

### *Тэма 19. Улазіны (уваходзіны)*

Асаблівасці будаўніцтва традыцыйнага народнага жылля. Выбар месца для хаты, падрыхтоўка і апрацоўка драўніны, закладка фундамента (закладзіны), узвядзенне страхі (кветка). Перасяленне ў новую хату. Рытуалы, накіраваныя на шчаслівае і заможнае пражыванне пэўнай сям'і на новым месцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. *Беларускія* народныя абрады / уклад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 128 с.

2. *Беларускія* народныя гульні і забавы / уклад. К. Л. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 1996. – 31 с.

3. *Беларускія* народныя танцы, карагоды і гульні / уклад. В. С. Семенякоў. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 125 с.

4. *Беларусы.* Грамадскія традыцыі / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 606 с. : іл.

5. *Дзіцячы* фальклор / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

6. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

7. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне. – 910 с.

8. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай ; кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Беларус. навука, 2006.

9. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай ; кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2009.

10. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 5 : у 2 кн., кн.1 : Цэнтральная Беларусь / В. І. Басько [і інш.] ; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с.

*Дадатковая*

1. *Беларуская* міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 506 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2. Беларускі* фальклор : Жанры, віды, паэтыка : у 6 кн. / рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2006.

*3. Беларусы* / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 7 : Вусная паэтычная творчасць. – 586 с.

*4. Восточно-славянский* фольклор : слов. науч. и нар. терминологии / АН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы ; редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

*5. Ліцвінка, В. Д.* Калыханкі і забаўлянкі: фальклорны зборнік / В. Д. Ліцвінка. – Мінск : РЦЭВД, 1992. – 48 с.

*6. Пропп, В. Я.* Собрание трудов : Поэтика фольклора / В. Я. Пропп. – М. : Лабиринт, 1998. – 351 с.

*7. Сучкоў, І. І.* Фальклорны тэатр беларусаў : праблемы паэтыкі і эстэтыкі (на матэрыяле XVIII–XX стст.) / І. І. Сучкоў. – Мінск : БДУК, 2004. – 306 с.

*8. Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с.

*9. Сям'я* і сямейны быт беларусаў / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 2002. – 345 с.

*10. Чистов, К. В.* Народные традиции и фольклор : Очерки теории / К. В. Чистов. – Л. : Наука, 1986. – 303 с.

*Літаратура для самастойнай работы студэнтаў*

*1. Арлова, Г. П.* Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 120 с.

*2. Афанасьев, А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу : опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований в связи с мифическими сказаниями других родственных народов : в 3 т. / А. Н. Афанасьев. – М. : Соврем. писатель, 1995. – Т. 1. – 212 с.

*3. Беларуская* «народная Біблія» ў сучасных запісах / уступ. артыкул, уклад. і камент. А. М. Боганевай. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 166 с.

*4. Беларускі* фальклор : хрэстаматыя / склад.: К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. – Мінск : Выш. шк., 1985. – 749 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Богатырев, П. Г.* Фольклор как особая форма творчества / П. Г. Богатырев, Р. О. Якобсон // Вопросы народного творчества. – М. : Искусство, 1971. – С. 369–383.
6. *Богданов, К. А.* Повседневность и мифология. Исследования по семиотике фольклорной действительности / К. А. Богданов. – СПб. : Искусство, 2001. – 439 с.
7. *Богданович, А. Я.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : Этнографический очерк / А. Я. Богданович. – Гродно : Губернская тип., 1895. – 185 с.
8. *Грамадскі* быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 248 с. : іл.
9. *Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с. : іл.
10. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая, У. В. Пашкевіч. – Мінск : Ул. М. Скакун, 1999. – 256 с.
11. *Дзіцячы* фальклор / рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 654 с.
12. *Дзіцячы* фальклор : зборнік фальклорных матэрыялаў / рэдкал.: У. А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2006. – 359 с.
13. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашыя продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мінск : Ураджай, 2001. – 178 с.
14. *Традыцыі* матэрыяльнай і духоўнай культуры ўсходняга Палесся : матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гомель : ГДУ, 2004. – Ч. 1. – 272 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з’яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (сацыяльна-гістарычных працэсаў, фактараў уплыву на іх развіццё і інш.). Веданне навуковай і даведачнай літаратуры па сямейна-абрадавым фальклоры |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне аб’ектаў вывучэння з тлумачэннем момантаў пераемнасці і ўзаемаўплываў). Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб’ектаў вывучэння, раскрыццё сутнасці з’яў і фармуліроўка вывадаў. Уменне аналізаваць рэгіянальныя асаблівасці сямейна-абрадавых комплексаў з улікам набытых ведаў. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Сістэмнае веданне студэнтам сямейна-абрадавага фальклору. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях дысцыпліны. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне вывучаных з’яў. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў сямейна-абрадавага фальклору, актуальных праблем навукі. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях вывучаемай дысцыпліны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Ацэнка і дыягностыка дасягненняў студэнтаў выконваецца паэтапна і ўключае:

– вуснае апытанне студэнтаў падчас занняткаў;
– выступленні на практычных і індывідуальных занятках;
– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі;
– выніковы кантроль у форме залікаў і экзаменаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ФАЛЬКЛОРНЫ ПРАКТЫКУМ**
**Раздзел 2. БЕЛАРУСКІЯ СЯМЕЙНА-РОДАВЫЯ АБРАДЫ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,05. Ул.-выд. арк. 0,61. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ